26

**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка”**

Факультэт беларускай і рускай філалогіі

Кафедра беларускага мовазнаўства

**Салімава**
**Вераніка Валехаўна**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Намінацыі адзення ў сучаснай беларускай літаратурнай мове

**Дыпломнае даследаванне**

**Навуковы кіраўнік –**
**кандыдат філалагічных навук,**
**дацэнт Старасценка Т.Я.**

**Мінск, 2013**

# РЭЗЮМЭ


**Тэма даследавання:** намінацыі адзення ў сучаснай беларускай літаратурнай мове.

**Мэта даследавання**: апісаць сістэму намінацый адзення ў сучаснай беларускай мове.

**Задачы даследавання:**

- пазнаёміцца з тэарэтычнай літаратурай па данай праблеме;
- выявіць найбольш поўны склад намінацый адзення ў сучаснай беларускай мове;
- раскласіфікаваць намінацыі адзення;
- апісаць словаўтваральную структуру намінацый адзення і іх этымалогію.

**Метадалогія даследавання:** метад лінгвістычнага апісання, метад колькасных падлікаў.

**Крыніцы даследавання:** ТСБМ (Тлумачальны слоўнік беларускай мовы), ТСБЛМ (Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы), ЭСБМ (Этымалагічны слоўнік беларускай мовы), Этимологический словарь русского языка: в 4 т. М. Фасмера, Гістарычны слоўнік беларускай мовы ў 18т.

**Аб'ект даследавання**: намінацыі адзення ў сучаснай беларускай літаратурнай мове.

**Прадмет даследавання**: семантычна-словаўтваральная структура намінацый адзення, іх паходжанне і стасункі з лексічнай сістэмай беларускай літаратурнай мовы.

**Структура:** праца складаецца з трох раздзелаў, уводзінаў, заключэння і дадатка. Першы раздзел прысвечаны агульнай характарыстыкі адзення як часткі матэрыяльнай і духоўнай культуры. У другім раздзеле намінацыі адзення разглядаюцца з боку семантыкі і этымалогіі. Тут асобна даследуюцца намінацыі лексіка-тэматычных груп, змястоўна падаецца іх лексічнае значэнне і паходжанне. Утварэнне намінацый адзення разглядаецца ў трэцім раздзеле, дзе прыводзяцца асноўныя спосабы словаўтварэння і адпаведныя да іх прыклады лексем. Да працы прыкладаецца дадатак А, дзе змешчана дыяграма колькасці (у %) лексем са значэннем адзення.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ